**Пераверзева Ю. А.**

# БІБЛІЯТЭЧНЫ ФОНД ЯК ФОРМА ІНТЭГРАЦЫІ ДАКУМЕНТАЎ У ГРАМАДСТВА: АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ Ў СУЧАСНАЙ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ

***Ключавыя словы:*** бібліятэка, бібліятэчны фонд, дакументы, камплектаванне і захаванасць бібліятэчнага фонду.

Бібліятэчны фонд ва ўсе часы прызнаваўся культурнай каштоўнасцю. У сучасным фондазнаўстве існуе пэўная колькасць трактовак паняцця “бібліятэчны фонд”, пры гэтым, на наш погляд, найбольш аптымальным і змястоўным з пункту гледжання раскрыцця яго значэння ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці з’яўляецца азначэнне, прапанаванае прафесарам Ю.М. Сталяровым. Пад бібліятэчным фондам ён прапаноўвае разумець «упарадкаваную сукупнасць афлайнавых і анлайнавых дакументаў, якія належаць пэўнай бібліятэцы, адпавядаюць задачам і профілю бібліятэкі, прызначаную для задавальнення рэальных і патэнцыяльных, інфармацыйных і маральных патрэбнасцей карыстальнікаў, якая фарміруецца зыходзячы з матэрыяльных і інтэлектуальных рэсурсаў» [8, с. 60]. Такая трактоўка дэманструе базавы статус фонду як інфармацыйнай крыніцы, дзе сканцэнтраваны дакументы і матэрыялы, у тым ліку рэдкія і каштоўныя, якія дазваляюць атаясамліваць бібліятэку як інстытут культурнай спадчыны і ўстанову-стваральніцу інфармацыйнага фундамента найноўшых дасягненняў у розных сферах жыцця.

Бібліятэчны фонд выконвае сістэмаўтваральную ролю ў дзейнасці бібліятэкі: садзейнічае рэалізацыі камунікатыўнай, мемарыяльнай і кумулятыўнай функцый. Ён забяспечвае бытаванне дакументаў як кампанентаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, без яго немагчыма развіццё культуры кнігі, культуры чытання, культуры кнігараспаўсюджвання [2]; ён стварае сацыяльную сілу чытання, якая на думку Ю.П. Мяленцьевай, ўздзейнічае на інтэлектуальны, тэхналанічны, маральна-этычны стан чалавецтва як віда [7, с. 319]. Бібліятэчны фонд як асноўны складнік бібліятэкі робіць яе «формай генерацыі культурнага фонду нацыі, захавальніцай яе гістарычнай памяці, уладальнікам унікальных дакументаў» [6].

Сёння бібліятэчны фонд – гэта спалучэнне нонэлектроннага (кнігі, часопісы, газеты і інш.) і электроннага (афлайнавы, анлайнавы, змешаны) сегментаў. Яго фарміраванне, захаванне, апрацоўка заўсёды былі і застаюцца прыярытэтнымі напрамкамі бібліятэчнай работы. Якасць яго зместу і афармлення залежыць ад кваліфікацыі бібліятэчнага супрацоўніка і выканання тэхналагічных рэжымаў фондавытвор-

часці, фондаэксплуатацыі, фондазахавання [8], рацыянальнага выкарыстання розных спосабаў камплектавання, што патрабуе прафесійнага маніторынгу інфармацыйнага рынку, вывучэння чытацкіх пераваг і запытаў, іх уплыву на змястоўныя і каштоўнасныя аспекты работы з фондамі. Да таго ж, фарміраванне і выкарыстанне бібліятэчнага фонду абумоўліваецца «фонавымі практыкамі для чытання» – фактарамі, да якіх адносяць сацыякультурны, сацыяльна-эканамічны, палітыка-тэхналагічны, дзейнасна-антрапалагічны [Цыт. па: 1, с. 41]. Гэтыя фактары ў кантэксце характарыстык сучаснага грамадства дэтэрмінуюць чытанне асобы і падштурхоўваюць бібліятэчных спецыялістаў да аптымальнага і рацыянальнага фарміравання інфармацыйных рэсурсаў з улікам таго, што пад уздзеяннем камп'ютарных тэхналогій «змяніўся працэс чытання – з'явіліся яго разнавіднасці: экраннае чытанне, аўдыячытанне, інтэрнэт-чытанне, мабільнае чытанне і г. д.» [Цыт. па: 1, с. 41]. Так, у фондах бібліятэк прадстаўлены дакументы, зафіксаваныя на CD/DVD-дысках, флэш-картах, ёсць электронныя рэсурсы сеткавага распаўсюджвання; бібліятэкі прадастаўляюць доступ карыстальнікам да шматлікіх ліцэнзійных электронных інфармацыйных рэсурсаў (Университетская библиотека онлайн, Электронно-библиотечная система «Лань», ЛитРес: Библиотека, ZNANIUM, EastView, EBSCO Complete, ProQuest Dissertations & Theses Global і інш.), якія задавальняюць іх навуковыя, вучэбныя, вытворчыя, мастацка-эстэтычныя патрэбы.

Для кожнай нацыі асобую каштоўнасць маюць нацыянальныя дакументы. Для Беларусі – гэта сукупнасць розных відаў дакументаў, створаных на яе тэрыторыі ў розныя гістарычныя перыяды, за яе межамі на беларускай мове, беларускімі аўтарамі, а таксама прысвечаных Беларусі. Бібліятэчныя калекцыі нацыянальных дакументаў – культурны здабытак, які адлюстроўвае непарыўную сувязь пакаленняў, сукупнасць культурных дасягненняў грамадства, яго гістарычны вопыт і сацыяльную памяць. Ён падлягае зберажэнню, даследаванню і памнажэнню. На гэтым акцэнтуюць увагу Т.В. Кузьмініч, Р.С. Матульскі, Л.Г. Кірухіна і шэраг іншых навукоўцаў і практыкаў у галінах бібліятэказнаўства і фондазнаўства.

Акрамя нацыянальных дакументаў у бібліятэчныя фонды беларускіх бібліятэк уключаюцца замежныя дакументы, неабходныя і запатрабаваныя для развіцця эканомікі краіны.

Так складваецца, што паўната і дынаміка фарміравання бібліятэчнага фонду абумоўліваецца пэўнымі акалічнасцямі. У адносінах да выпуску айчынных кніг і брашур трэба адзначыць паступовае скарачэнне выпуску ўсіх відаў друкаваных выданняў за апошнія 10 гадоў (за 2010–2019 гады на 32,9%), адносную стабілізацыю колькас-

ных паказчыкаў выпуску друкаваных кніг (колькасць назваў і тыражоў) за апошнія 4 гады, значнае дамінаванне ў кніжным патоку колькасці малатыражных выданняў, удзельная вага якіх у апошнія 5 гадоў трымаецца ў межах 60%, прэваліраванне выпуску вучэбных выданняў, штогадовае павелічэнне выпуску перакладных выданняў, узмацненне канкурэнтных пераваг электронных сродкаў інфармацыі ў адносінах да друкаваных крыніц пераважна рэкламнага, даведачнага характару, паступовая інтэграцыя лічбавых тэхналогій у выдавецкую справу [4].

Удзельнікі шматлікіх дыскусійных пляцовак (бібліятэкары, выдаўцы, кнігагандляры) сведчаць, што, напрыклад, ў Расіі фіксуецца нестабільнасць выхаду друкаванай прадукцыі па назвах і тыражах, павялічваецца доля e-book на кніжным рынку. Як і ў краінах Захаду пачынаецца выкарыстанне тэхналогіі друку па патрабаванні, якая пэўным чынам стрымлівае паступленні ў фонды бібліятэк друкаваных выданняў.

Тым не менш, адзначаецца «павелічэнне аб'ёму Бібліятэчнага фонда Рэспублікі Беларусь (на 12 жніўня 2020 г. – 52 561 443 адзінкі)» [3].

У Беларусі прадугледжаны шэраг мер па падтрымцы кніжных фондаў бібліятэк:

– згодна з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не менш за 12% ад сумы, якая выдаткоўваецца на ўтрыманне бібліятэк, павінна накіроўвацца на камплектаванне;

– Кодэксам Рэспублікі Беларусь «Аб культуры» (глава 18 «Бібліятэчная справа») замацаваны асноўныя напрамкі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, звязаныя з фарміраваннем бібліятэчных фондаў (камплектаванне, кіраванне, арганізацыя, выключэнне дакументаў); прапісаны шляхі камплектавання (абавязковы бясплатны экзэмпляр, набыццё і падпіска, дакументаабмен, атрыманне, стварэнне копій дакументаў у электронным выглядзе, ахвяраванні); прадугледжана вядзенне Дзяржаўнага рэестра кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь;

– на тэрыторыі краіны функцыянуе Палажэнне аб абавязковым бясплатным экзэмпляры дакументаў, зацверджанае пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 верасня 2008 г. № 1284, якое рэгулюе парадак рассылкі абавязковага экзэмпляра друкаванай і электроннай прадукцыі, якая выйшла ў свет на беларускіх паліграфічных прадпрыемствах ці выраблена за мяжой рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь; правы і абавязкі яго вытворцаў і атрымальнікаў; устанаўлівае пералік дзяржаўных арганізацый, у т. л. бібліятэк, куды павінен трапляць абавязковы экзэмпляр;

– Дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі» на 2021–2025 гады прадугледжваюцца мерапрыемствы, накіраваныя на папаўненне бібліятэчнага фонду рэспублікі;

– штогод у рамках дзяржаўнага заказу ў адпаведнасці з Палажэннем аб парадку фарміравання плана выпуску сацыяльна значных выданняў, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2013 г. № 501, выдаюцца сацыяльна значныя выданні, якія накіроўваюцца ў бібліятэчныя фонды па ўсёй краіне.

Развіццё і інтэнсіўнасць напаўнення і выкарыстання фондаў беларускіх бібліятэк звязана са станам кнігавыдавецкай справы. Яе ўстойлівае функцыянаванне заклікана падтрымаць дзяржаўная праграма «Масавая інфармацыя і кнігавыданне» на 2021–2025 гады, дзе акцэнты зроблены на выкарыстанне патэнцыялу айчыннага кнігавыдання, задавальненне патрэбнасці беларускага грамадства ў літаратуры, якая садзейнічае замацаванню культурнага, духоўнага, інтэлектуальнага патэнцыялу нацыі. Таксама важнымі фактарамі з’яўляюцца падтрымка і ўмацаванне эканамічных, культуралагічных, сацыяльных функцый кнігі, сберажэння яе жанравай і тэматычнай разнастайнасці, адаптацыя да зменлівых эканамічных умоў [5].

Захаванню дакументаў, якія знаходзяцца ў бібліятэчных фондах, надаецца асобая ўвага. «Паляпшаецца матэрыяльная база ўстаноў культуры, удасканальваецца нацыянальнае заканадаўства, < > вядзецца дзяржаўны ўлік гісторыка-культурных каштоўнасцей, ажыццяўляецца інфарматызацыя ўстаноў культуры» [5, с. 27]. Важным крокам да аднаўлення і захавання дакументаў, асабліва рэдкіх і старадрукаваных, стала алічбоўка фондаў, віртуальная рэканструкцыя матэрыялаў, факсіміле, стварэнне адпаведных электронных інфармацыйных рэсурсаў і арганізацыя доступу да іх шырокіх колаў грамадскасці і спецыялістаў. У гэтым напрамку вядомасць атрымалі праекты: «Книжное наследие Франциска Скорины», «Беларусь і Біблія», «1000-годдзе Брэста: праз прызму старадаўніх дакументаў», «Слонім і наваколле праз прызму гістарычных дакументаў, паданняў, даследаванняў», «Навагрудак. Наваградак. Новогрудок. Nowogródek: старажытны горад у дакументах і матэрыялах», «Быхаў – старажытны беларускі фарпост», зводны электронны інфармацыйны рэсурс «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі». З дапамогай зводнага электроннага каталога бібліятэк Беларусі і рэгіянальных зводных электронных каталогаў карыстальнікам аператыўна становіцца даступнай бібліяграфічная інфармацыя аб выданнях з фондаў бібліятэк.

У цэлым, развіццё фондаў бібліятэк – аб’ёмістая, працаёмкая справа. Ёсць патрэба ў ажыццяўленні комплексных мерапрыемстваў па папаўненні фондаў бібліятэк актуальнымі, новымі дакументамі,

прыцягненні да гэтага спонсарскай дапамогі. Камплектаванне павінна своечасова фінансавацца; у бібліятэкараў-камплектатараў павінна быць магчымасць аператыўнага выкарыстання найноўшых крыніц інфармацыі аб бягучых і рэтраспектыўных дакументах, якія ёсць на кнігагандлёвым рынку; профільнага павышэння кваліфікацыі, засваення новых форм і метадаў работы, абмену вопытам.


1. Безнюк, Д. К. Современные социокультурные факторы чтения: опыт определения / Д. К. Безнюк // Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития : к 95-летию Центр. науч. б-ки НАН Беларуси : материалы XII Белорус.-Рос. науч. семинара-конф., Москва, 26–27 марта 2020 г. / Междунар. ассоц. акад. наук [и др.] ; сост.: Л. А. Авгуль, Н. В. Вдовина ; редкол.: Л. А. Авгуль [и др.]. – Минск ; М., 2020. – С. 39–43.
2. Васильев, В. И. Книжная культура в отечественной истории: теоретические и историко-книговедческие аспекты (XVIII – начало XXI в.) : дис. в виде науч. докл. ... д-ра ист. наук : 05.25.03 ; 07.00.02 / В. И. Васильев. – М., 2005. – 100 л.
3. Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021–2025 годы [Электронный ресурс] : утв. постановлением Совета Министров Респ. Беларусь, 29 янв. 2021 г., № 53 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100053. – Дата доступа: 06.09.2021.
4. Государственная программа «Массовая информация и книгоиздание» на 2021–2025 годы [Электронный ресурс] : утв. постановлением Совета Министров Респ. Беларусь, 18 янв. 2021 г., № 21 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/upload/docs/op/C22100021_1611176400.pdf. – Дата доступа: 07.09.2021.
5. Кірухіна, Л. Г. Захаванне нацыянальнай дакументальнай спадчыны ў межах дзяржаўнай праграмы "Памяць Беларусі" / Л. Г. Кірухіна // Інфармацыйныя рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: праблемы фарміравання і выкарыстання : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. В. Кузьмініч ; рэдкал.: Л. Г. Кірухіна [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 25–32.
6. Матвеева, Е. А. Комплектование библиотек: значение процесса для сохранения национальной культуры, основные источники пополнения библиотечных фондов [Электронный ресурс] / Е. А. Матвеева // Омс. науч. вестн. – 2003. – № 1. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/komplektovanie-bibliotek-znachenie-protsessa-dlya-sohraneniya-natsionalnoy-kultury-osnovnye-istochniki-popolneniya-bibliotechnyh. – Дата доступа: 07.09.2021.
7. Мелентьева, Ю. П. Энергия чтения / Ю. П. Мелентьева // Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов, 2021 : материалы VI Междунар. науч. конф., Гродно, 26–27 мая 2021 г. / Междунар. ассоц. акад. наук [и др.] ; сост.: Л. А. Авгуль, Н. В. Вдовина ; редкол.: Л. А. Авгуль [и др.]. – Минск ; М., 2021. – С. 318–320.
8. Столяров, Ю. Н. Признаки библиотечного фонда как научного понятия. Дефиниция понятия «Библиотечный фонд» / Ю. Н. Столяров // Науч. и техн. б-ки. – 2014. – № 10. – С. 52–60.